**Красоўскі, Д.** Інакш не мог / Д. Красоўскі // Полацкі веснік. — 1998. — 13 лют. — С. 2—4.

# ІНАКШ НЕ МОГ

Нядаўна ў адной з радыёперадач прагучала песня, у якой былі вось гэтыя словы:

«На афганской выжженной земле

Спят тревожно русские солдаты...»

Яны вельмі ўразілі мяне. Доўга потым думалася аб тых маці, якія не дачакаліся сваіх сыноў з той вайны. Між волі ў маіх думках з'явіўся вобраз маці загінуўшага воіна-інтэрнацыяналіста Раісы Сяргееўны Каваленка.

Даўно ведаю гэту сціплую жанчыну, добрасумленную працаўніцу. Але доўгі час не мог задаць ей пытання, каб неяк падрабязней даведацца пра яе сына, пра той подзвіг, які ён здзейсніў у далёкім Афганістане.

І ўсё ж гэтая песня па-асабліваму падштурхнула маю рашучасць і я адважыўся напрасіцца у Раісы Сяргееўны на сустрэчу.

Мой званок да яе, я адразу адчуў па голасе, узрушыў яе сэрца. Яна спачатку памаўчала, а потым ціха сказала: «Мабыць не трэба?» Але ў канцы размовы мы дамовіліся аб сустрэчы.

І вось мы у Завозер'і. З Раісай Сяргееўнай сустрэліся ў канторы саўгаса «Тураўлянскі», у якім яна працуе кадравіком. Глядзіш на яе і наяву бачыш рысы тых жанчын, пра якіх так пранікнёна сказаў А. Н. Някрасаў: «Есть женщины в русских селеньях...»

Колькі бед абрушваў лёс на яе пасівелую галаву?! Смерць сына ў далёкім Афгане, заўчасную смерць мужа. Няхай сабе, што яны ўжо у большасці дарослыя, але ж яна маці шасцярых дзяцей. Хто не гадаваў, той можа і не ведае, як вывесці ў людзі хаця б аднаго. А Раісе Сяргееўне не сорамна за ўсіх, хто выйшаў з-пад яе крыла: Сашу, Толю, Сярожу, Свету, Лену і яго, загінуўшага ў далёкіх халодных прасторах Афгана, Колю.

Пра яго ў нас напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і размова.

– Ну што я вам скажу пра сына? – пытаннем на наша пытанне адказвае Раіса Сяргееўна. – Добры быу сын. З чулым сэрцам. Ён у мяне адзін быў ад першага мужа, але як любіў усіх пецярых астатніх! Здружыўся і з бацькам. Яму імпанавала, што той быў добрым знаўцам тэхнікі. І Коля цягнуўся за ім. Радасцю свяціліся яго вочы, калі бацька дазваляў яму садзіцца самастойна за рычагі трактара. Пасля школы, атрымаўшы правы, Коля некаторы час працаваў механізатарам у саўгасе. Падмяняў бацьку, калі той быў у адпачынку. Запомніўся такі выпадак: з работы вярнуўся ўзрушаны, задаволены сабой – не адстаў ад вопытных механізатараў на вывазцы торфу. Але гляджу, што прыйшоў ён дадому без ватнікаў. Нешта ён наконт гэтага мне тлумачыў, але толькі пасля даведалася, што, каб не адстаць, ён, калі забуксаваў яго трактар, кінуў сваю вопратку пад колы. Таму і не адстаў. Я не папракала яго.

І вось мне расказвае яго афганскі сябар-пабрацім, на руках якога паранены і знявечаны Коля памёр:

– Наш БТР прарываўся праз шчыльны ланцуг душманаў. У крытычны момант вадзіцель быў смяротна паранены. Коля імгненна кінуўся, каб замяніць яго, але варожая куля спыніла яго парыў. Ён упаў і, паранены, трапіў яшчэ пад колы неўпраўляемага бэтээра.

– Мне балюча нават ва ўяўленні ўспрымаць тое, што перажыў мой сын у апошнія імгненні яго жыцця, – гаворыць Раіса Сяргееўна. – Але разумею, што ён не мог паступіць інакш. Ён быў ва ўсім такі.

...Напаваротку да Завозер'я здаўна размешчаны вясковыя могілкі. Раіса Сяргееўна расказвае, што як ўразіў той шчымліва-сумны позірк сына на гэта святое для завозерцаў месца, калі яго праводзілі на вайсковую службу: быццам адчуваў, што вернецца ён толькі сюды. І вярнуўся. Ляжыць ён побач з бацькам, ля самай дарогі да Завозер'я. Абодвы яны любілі машыны, рух, жыццё. І абодвум можа і не маркотна ў тым гаме і шуме, якім жыве ажыўленая мінская шаша, ды і наш зваротак да цэнтра саўгаса.

– А як вы, як вам жывецца з такім нялёгкім багажом?

– Ды як сказаць? Не скарджуся. Радуюся за дзяцей, унукаў. Часамі дапамагаюць сябры сына. Ён не паспеў іх многа займець. Але тыя, з кім выходзіў з дзяцінства, памятаюць, дапамагаюць. Вось і летась сябра яго Коля Емяльяненка сена прывёз. Алік з лясніцтва цікавіцца, калі што трэба...

Сціплыя патрэбы, сціплыя адказы, можа і больш сціплыя, чаго заслугоўваюць ад нашага грамадства сем'і загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў. Дурная гэта была вайна. Але ж не вінаватыя ў тым нашы дзеці, што іх кінулі ў яе чэрава. Іх, загінуўшых, і нават да сёння не падлічаных, было многа. А ў нас у раёне ўсяго чацвёра такіх сем'яў. Дык няўжо мы не ў стане дапамагчы ім рашаць тыя самыя сціплыя, без асаблівых прэтэнзій праблемы. Хай бы хоць адзін раз у год чыноўнік ці кіраўнік, ад якога залежыць гэта, скажам, у Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, паставіў сябе, сваю сям'ю на месца гэтых знявечаных сем'яў, адчуў іх боль, іх патрэбы. Можа б і менш было праблем.

Можа так і будзе.

На развітанне я разам з супрацоўнікамі рэдакцыі газеты «Полацкі веснік» пажадаў Раісе Сяргееўне ўсяго найлепшага ў жыцці, мужнасці, якой, я заўважыў, ёй не займаць, дабрабыту і шчасця. Разам з ёй мы схілілі галовы на магіле яе сына і мужа на Завозерскіх могілках. А яна ўсё стаяла і стаяла ля помніка як першынцу, загінуўшаму ў Афгане, быццам стараючыся сагрэць яго граніт сваім нязгасным мацярынскім цяплом. Гэты момант і адлюстраваны на фотаздымку фотакарэспандэнта «Полацкага весніка» К. Жарнасека.

**Д. Красоўскі,**
**старшыня ветэранскай арганізацыі Полацкага раёна**